САВЕТ ФЕДЭРАЦЫІ
ПРАФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ

ПРЭЗІДЫУМ

ПАСТАНОВА

СОВЕТ ФЕДЕРАЦИИ
ПРОФСОЮЗОВ БЕЛАРУСИ

ПРЕЗИДИУМ

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

21.12.2018 № 348

г. Мінск г. Минск

Аб унясенні дапаўненняў у пастанову Прэзідыума Савета ФПБ ад 30.11.2015 № 451

Прэзідыум Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Унесці ў Палажэнне аб Ганаровай грамаце Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, зацверджанае пастановай Прэзідыума Савета ФПБ ад 30 лістапада 2015 г. № 451, наступныя дапаўненні:

1.1. у пункце 2:

дапоўніць пункт пасля абзаца другога абзацам наступнага зместу:

"прафсаюзных арганізацый у адпаведнасці з крытэрыямі вызначэння лепшых прафсаюзных арганізацый па выніках каляндарнага года, якія дадаюцца;";

абзацы трэці – дзявяты лічыць адпаведна абзацамі чацвёртым – дзясятым;

1.2. частку першую пункта 8 дапоўніць сказам наступнага зместу: "Прафсаюзным арганізацыям, якія вызначаны лепшымі па выніках каляндарнага года, у дадатак да гэтага ўручаецца штандар устаноўленага ўзору з выявай эмблемы ФПБ.";

1.3. дапоўніць гэта Палажэнне дадаткам (дадаецца).

2. Выканкаму Савета ФПБ прыняць меры па вырабе штандара.

Старшыня
Федэрацыі прафсаюзаў М.С.Орда

Аппарат Совета Федерации профсоюзов Беларуси
Для документов
02

Дадатак
да Палажэння аб Ганаровай грамаце Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі

КРЫТЭРЫІ

вызначэння лепшых прафсаюзных арганізацый па выніках каляндарнага года

1. Высокі ўзровень ахопу прафсаюзным членствам работнікаў (навучэнцаў) на працягу апошніх 3 гадоў, работы па ўліку членаў прафсаюза, фарміраванні статыстычнай справаздачнасці.

2. Своечасовае і ў поўнай меры выкананне рашэнняў вышэйстаячых прафсаюзных органаў.

3. Стан фінансавай дысцыпліны, работа рэвізійнай камісіі, выкананне пастановы Прэзідыума Савета ФПБ ад 30 лістапада 2015 г. № 438 "Аб стандарце прафсаюзнага бюджэту" і інш.

4. Практыка сацыяльнага партнёрства (узровень дадатковых сацыяльных гарантый, замацаваных у калектыўным дагаворы, кантроль за яго выкананнем, адпаведнасць норм калектыўнага дагавора нормам Генеральнага, тарыфнага, мясцовых пагадненняў, удзел у рэгуляванні сацыяльна-працоўных адносін у калектыве, размеркаванні стымулюючых выплат і г.д.).

5. Ажыццяўленне грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства аб працы, аказанне прававой дапамогі.

6. Ажыццяўленне грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства аб ахове працы.

7. Работа па навучанні прафсаюзнага актыву.

8. Правядзенне культурна-масавых, спартыўных і фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў, работа па санаторна-курортным лячэнні і аздараўленні членаў прафсаюза.

9. Інфармацыйная работа (наяўнасць і змест інфармацыйных стэндаў, сайта (старонкі на сайце вышэйстаячай прафсаюзнай арганізацыі, арганізацыі – сацыяльнага партнёра), бюлетэняў, публікацый у СМІ з інфармацыяй аб сваёй дзейнасці, падпіска на газету "Беларускі Час" і г.д.).

10. Арганізацыя настаўніцтва, сістэмнай работы з моладдзю, у тым ліку маладымі спецыялістамі.

11. Работа з ветэранамі вайны і працы – членамі прафсаюза.

12. Рэгулярнасць правядзення статутных мерапрыемстваў, актуальнасць разглядаемых пытанняў, эфектыўнасць прынятых рашэнняў, арганізацыя работы камісій прафсаюзнага камітэта.

13. Стан справаводства ў адпаведнасці з наменклатурай спраў.